# § 23–24. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага, дзейнасць вялікіх князёў па ўмацаванні дзяржавы

ГАСПАДАР СОЙМ
МІНДОЎГ ЯГАЙЛА
ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ
УНІЯ ВІТАЎТ
ГЕДЫМІН РАДА
АЛЬГЕРД ВІЛЬНЯ
КЕЙСТУТ НОВАГАРОДАК

**1. Палітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе ў сярэдзіне XIII ст.** Мангольскае нашэсце 1237–1241 гг. на старажытнарускія землі адыграла важную ролю ў развіцці дзяржаўнасці ўсходніх славян. На рэштках Старажытнарускай дзяржавы паступова фарміраваліся новыя дзяржаўныя ўтварэнні — Вялікае Княства Літоўскае і Маскоўскае княства.

**Узаемадзеянне славянскага і балцкага насельніцтва**

Яшчэ ў Высокім сярэдневяччы ўсходнія славяне актыўна асвойвалі рэгіён Верхняга Панямоння, узаемадзейнічалі з балцкімі плямёнамі — літвой, латгаламі, земгаламі і інш. Калі першапачаткова літва плаціла даніну Русі, то праз нейкі час перайшла да нападаў. У першай палове XIII ст. вырасла роля гэтага балцкага племені. Яно актыўна ваявала з мазавецкімі, галіцка-валынскімі, наўгародскімі князямі. Землі Панямоння ў гэты час яшчэ знаходзіліся ў стане раздробленасці.

У літоўскіх землях у пачатку XIII ст. адбываліся важныя працэсы: расла сацыяльная няроўнасць, вылучаліся знатныя людзі, сярод якіх найбольшы

ўплыў мелі ваенныя правадыры. Супольныя паходы на суседзяў і знешняя небяспека ў асобе нямецкіх рыцараў-крыжакоў спрыялі аб'яднанню літоўскіх плямёнаў.

**«Літва Міндоўга»**

У 1219 г. у летапісе згадваюцца літоўскія князі (сярод іх і *Міндоўг*), якія заключылі дамову з Галіцка-Валынскім княствам. А ў 1235 г. на старонках летапісу з'яўляецца запіс пра «Літву Міндоўга». Гэты князь «адных супраціўнікаў забіў, іншых выгнаў з Літвы і стаў княжыць адзін ва ўсёй зямлі Літоўскай».

У 1248 г. Міндоўг вядомы ўжо як валадар Новагародка, Ваўкавыска, Слоніма і Здзітава. Як літоўскі князь атрымаў уладу над тэрыторыяй Панямоння — невядома, але без падтрымкі мясцовага славянскага насельніцтва ён наўрад ці здолеў бы застацца кіраваць на славянска-літоўскім памежжы.

**Новая дзяржава**

Міндоўг зрабіў вельмі важны палітычны крок — прыняў каталіцтва, а затым у 1253 г. каранаваўся. Пры гэтым Папа Рымскі Інакенцій IV абвясціў, што прымае новае каралеўства пад сваю апеку. Гэтыя крокі пазбавілі рыцараў-крыжакоў нагоды для нападаў на ўладанні Міндоўга і дазволілі яму перамагчы сваіх праціўнікаў у літоўскіх землях. Аднак літоўскі «кароль» мусіў саступіць Тэўтонскаму ордэну шэраг літоўскіх «валасцей».



*Хрышчэнне Міндоўга. Невядомы аўтар*

Так ва Усходняй Еўропе пачала складвацца новая дзяржава — *Вялікае Княства Літоўскае* (ВКЛ). Магчыма, такую назву тэрыторыя атрымала ўжо ў часы Міндоўга. Ад часоў Гедыміна дзяржава пачала называцца Вялікім Княствам Літоўскім і Рускім, а з 1442 г. яе афіцыйная назва зрабілася трохсастаўнай: *Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае*.

**2. Прычыны ўтварэння новай дзяржавы.** Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага было абумоўлена шэрагам прычын. З аднаго боку, гэта працэсы, якія адбываліся ў літоўскіх плямёнах: з'яўленне няроў-

насці, аб'яднанне плямёнаў пад уладай вайсковых правадыроў (князёў).

**Аб'яднанне дзеля абароны**

З іншага боку, вялікае значэнне мелі знешнія фактары. На значнай частцы тэрыторыі Старажытнай Русі ў той час усталявалі сваю ўладу манголы, якія стварылі ў Паўночным Прычарнамор'і, Паволжы, Закаўказзі, частцы Цэнтральнай Азіі і Заходняй Сібіры моцную дзяржаву — Залатую Арду. Баярства Верхняга Панямоння пайшло на разрыў са старажытнарускай палітычнай сістэмай, паводле якой уся Русь лічылася супольнай вотчынай Рурыкавічаў, і ўсталявала ў Навагародку ўладу Міндоўга. Менавіта гэта дазволіла пазбегнуць падпарадкавання Ардзе.

Аб'яднацца вымушала і небяспека з боку нямецкіх рыцараў, якія працягвалі экспансію на землі балтаў. Толькі разам усходнія славяне на захадзе Русі і прыбалтыйская літва здолелі супрацьстаяць абедзвюм пагрозам.

**Тэрытарыяльная аснова ВКЛ**

**3. Шляхі ўваходжання ўсходнеславянскіх зямель у новую дзяржаву.** Першапачаткова ў склад ВКЛ (дзяржава Міндоўга) уваходзілі землі этнічнай Літвы (у вузкім сэнсе — Аўкштайція) і ўсходнеславянская тэрыторыя Панямоння (Навагародчына). У залежнасці апынуліся балцкія (Жамойць) і ўсходнеславянскія землі (Полацкае княства). Канчаткова ўключэнне ў склад ВКЛ Полацкай зямлі адбылося пры вялікім князю *Віценю* (1295–1316 гг.). Менавіта гэтыя тэрыторыі ў пачатку XIV ст. склалі тэрытарыяльнае ядро ВКЛ.

**Пашырэнне межаў ВКЛ**

Наступныя вялікія князі літоўскія разгарнулі шырокую экспансію на ўсходнеславянскія землі. Далучэнне да ВКЛ ішло трыма шляхамі: дагаворным, праз дынастычныя шлюбы і вайсковым. Ва ўмацаванні ўлады і ўсталяванні парадку былі зацікаўлены ўсе пласты насельніцтва новай дзяржавы: феадалы, купцы, рамеснікі, простыя землеўладальнікі.

**Вялікі князь Гедымін**

**4. Дзейнасць вялікіх князёў літоўскіх па фарміраванні тэрыторыі дзяржавы.** У XIV ст. улада вялікіх




князёў літоўскіх пашырылася на ўсе сучасныя беларускія і значную частку сучасных украінскіх зямель. Пры вялікім князю *Гедыміну* (1316–1341 гг.) у склад ВКЛ увайшлі Віцебскае, Друцкае, Менскае і Турава-Пінскае княствы. Сын Гедыміна Альгерд ажаніўся з дачкою апошняга віцебскага князя Яраслава, пасля смерці цесця яго ўладанні перайшлі ў склад ВКЛ мірным шляхам. У часы Гедыміна пачынаецца ўключэнне ў склад ВКЛ і сучасных украінскіх зямель. Сын Гедыміна Любарт ажаніўся з дачкой аднаго з валынскіх князёў і пасля смерці апошняга князя замацаваўся ў Луцку. У выніку Валынь адышла да ВКЛ, а Галіцыя — да Польшчы.

**Вялікі князь Альгерд**

Велізарныя па плошчы ўсходнеславянскія тэрыторыі былі далучаны да ВКЛ у праўленне *Альгерда* (1345–1377 гг.). Дзейны кіраўнік і таленавіты палкаводзец здолеў падпарадкаваць падняпроўскія воласці (Магілёў, Гомель), Мсціслаўскае княства (раней належала Смаленску), Кіеўскую і Чарнігава-Северскую землі. Пашырэнню тэрыторыі ВКЛ спрыяла аслабленне ў гэты час Залатой Арды. У *1362 г.* падчас бітвы на рацэ Сінія Воды Альгерд здолеў нанесці паражэнне ардынскім войскам. У выніку большая частка сучасных украінскіх зямель увайшла

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

А. «Не разбураць старызны, не ўводзіць навізны» — менавіта пад такім дэвізам кіраваў Гедымін. Землям, якія ўваходзілі ў склад ВКЛ мірным шляхам, былі гарантаваныя наступныя правы: недатыкальнасць уласнасці, захаванне мясцовых законаў і правоў феадалаў, мяшчан і духавенства, ранейшыя дзяржаўныя органы кіравання, самастойнасць у заключэнні гандлёвых пагадненняў і інш.

Б. Загадам Гедыміна было распачата будаўніцтва каменных замкаў па лініі Трокі — Вільня — Меднікі — Гародня — Навагародак — Ліда — Крэва — Мядзел.



*Помнік Гедыміну ў г. Ліда*

В. Вялікі князь усё жыццё правёў у ваенных паходах разам са сваёй дружынай, далучыўшы да ВКЛ немалыя землі. Нават здабыўшы славу сапраўднага военачальніка і доблеснага палкаводца, ужо старым чалавекам, Гедымін працягваў асабіста кіраваць войскам падчас ваенных паходаў.

1. *Пра якія асаблівасці праўлення, якасці асобы і дзяржаўныя заслугі вялікага князя Гедыміна сведчыць кожны з прыведзеных тэкстаў?*
2. *Якія дзеянні Гедыміна, на вашу думку, былі найбольш значныя для ўмацавання дзяржавы?*

ў склад ВКЛ. У другой палове XIV ст. у склад ВКЛ увайшлі землі Падляшша.

У часы праўлення Альгерда ВКЛ пачынае спаборнічаць з Маскоўскім княствам за панаванне на землях Русі. У 1368, 1370 і 1372 гг. вялікі князь выступаў паходамі на Маскву. З цягам часу супрацьстаянне ўзмацнялася. За час праўлення Альгерда тэрыторыя ВКЛ павялічылася больш чым у два разы. Пасля яго смерці вялікім князем літоўскім быў абвешчаны *Ягайла* (1377–1392 гг.).



*Помнік Альгерду ў г. Віцебск*

**5. Значэнне старажытнарускай спадчыны ў арганізацыі Вялікага Княства Літоўскага і Рускага.** Этнічныя літоўцы складалі ў ВКЛ меншасць у параўнанні з усходнімі славянамі — продкамі сучасных

беларусаў і ўкраінцаў. Літоўскі элемент намагаўся дамінаваць у палітычнай, а ўсходнеславянскі — у культурнай і эканамічнай галінах жыцця ВКЛ. Старабеларуская («руская») мова з'яўлялася афіцыйнай мовай дзяржавы.



Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ у 1315–1377 гг.

Вывучыўшы картасхему, ацаніце ролю Гедыміна і Альгерда ў пашырэнні межаў і ўмацаванні ВКЛ.

Эканоміка, культура і паўсядзённы лад жыцця ўсходніх славян захаваліся ў ВКЛ. Не былі адразу адкінуты і традыцыі палітычнага развіцця, механізм функцыянавання дзяржаўнага апарату, што складваўся цягам стагоддзяў.

Князі літоўскага паходжання скарысталіся тытуламі старажытнарускіх князёў. Многія пасады ў кіраўніцтве Вялікага Княства Літоўскага таксама ўзыходзяць да традыцый кіравання Старажытнай Русі.

Захаванне старажытнарускіх парадкаў

**6. Дзяржаўны лад і сістэмы кіравання.** Паступова ў галіне кіравання дзяржавай фарміраваліся свае асаблівасці. Вялікае Княства Літоўскае было неабмежаванай манархіяй. Вярхоўным валадаром дзяржавы быў *гаспадар*, або вялікі князь. Ён кіраваў войскам, мог заключаць саюзы з іншымі дзяржавамі, абвяшчаць вайну, заключаць мір. У яго руках знаходзілася заканадаўства — ён выдаваў граматы і іншыя прававыя акты. Вялікі князь кіраваў фінансава-гаспадарчай дзейнасцю ва ўсёй дзяржаве і сваім асабістым дамене.

Гаспадар ВКЛ

Як вы лічыце, чаму ў міжнароднай перапісцы гаспадароў называлі каралямі?

У канцы XIII — XIV ст. пры вялікім князю існавала *велікакняжацкая рада*, якая была дарадчым органам. У яе гаспадар уключаў уплывовых, карысных і патрэбных яму людзей, звычайна сваіх родзічаў. Да XV ст. адносіцца і пачатак склікання больш шырокіх сходаў — **соймаў**, якія бяруць свой пачатак са старажытных вечавых сходаў.

Органы ўлады і службовыя асобы

**Сойм** — дарадчы, а з XVI ст. галоўны заканадаўчы орган ВКЛ, што складаўся з найвышэйшых чыноўнікаў, духавенства і прадстаўнікоў шляхты.

Асаблівасцю дзяржаўнага апарату ВКЛ была адсутнасць калегіяльных галіновых органаў кіравання. Замест іх стваралася шырокая сістэма пасад (урадаў), заснаваная на прынцыпах прызначэння і асабістай адказнасці. Службовыя асобы — *ураднікі* — ажыццяўлялі паўсядзённае кіраўніцтва дзяржаўнымі справамі. Урады дзяліліся на вышэйшыя і ніжэйшыя. Апроч вышэйшых ураднікаў існавалі службовыя асобы, якія загадвалі вузейшым колам пытанняў кіравання: канюшыя, падключыя, ключнікі, лоўчыя, стайнікі і інш.

Даведайцеся, якія абавязкі былі ў пералічаных ніжэйшых ураднікаў.

## ВЫШЭЙШЫЯ ЎРАДЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА




**Барацьба за велікакняжацкі трон**

**7. Унутрыпалітычная барацьба ў ВКЛ у канцы XIV ст. Узмацненне велікакняжацкай улады ў перыяд праўлення Вітаўта.** У 1385 г. паміж ВКЛ і Польшчай была заключана Крэўская унія. Яна выклікала незадаволенасць часткі знаці ВКЛ як балцкага, так і ўсходнеславянскага паходжання, якая не хацела мірыцца са стратай незалежнасці дзяржавай. Сваім намеснікам у ВКЛ *Ягайла* пакінуў брата Скіргайлу, але той не знайшоў падтрымкі ў родзічаў. Першым узняў мяцеж *Андрэй Полацкі* (адзін з сыноў Альгерда), які заявіў, што Ягайла пасля прыняцця каталіцтва не можа быць валадаром Літвы і Русі. Але ўвесну 1387 г. Скіргайла захапіў Полацк і паланіў бунтаўшчыка. Зімой 1389/1390 г. супраць Ягайлы выступіў Вітаўт, яго стрыечны брат.

**Пераход улады да Вітаўта**

У 1392 г. Ягайла і Вітаўт заключылі *Востраўскае пагадненне*, паводле якога Вітаўт рабіўся вялікім князем літоўскім, але пры гэтым прызнаваў за-

лежнасць ад Ягайлы. Так быў зроблены першы крок да аднаўлення незалежнасці Вялікага Княства.

У 1401 г. была падпісана *Віленска-Радамская унія*, паводле ўмоў якой Вітаўт пажыццёва заставаўся на чале ВКЛ пры ўмове прызнання вяршэнства Ягайлы. Пасля смерці Вітаўта ўлада павінна была перайсці да польскага караля і яго нашчадкаў, калі ж Ягайла памрэ бяздзетным, польская знаць мела ўзгадніць кандыдатуру новага караля з Вітаўтам.

У 1413 г. на з’ездзе паноў і баяр Польшчы і ВКЛ у замку Гародла была зацверджана новая *Гарадзельская унія*. Паводле яе ўмоў ВКЛ захоўвалася як дзяржава і пасля смерці Вітаўта. Баяры ВКЛ абавязваліся не выбіраць вялікага князя без згоды Ягайлы, а польскія паны — новага караля без узгаднення з вялікім князем літоўскім. Такім чынам, Вітаўт здолеў адстаяць незалежнасць ВКЛ. Умовы Крэўскай уніі аб уключэнні дзяржавы ў склад Каралеўства Польскага засталіся толькі на паперы.

## ПАГАДНЕННІ ПАМІЖ ВКЛ І ПОЛЬШЧАЙ




### Росквіт ВКЛ

Вялікі князь літоўскі *Вітаўт* (1392–1430 гг.) праводзіў актыўную ўнутраную і знешнюю палітыку. На працягу свайго праўлення ён вырашаў дзве найважнейшыя знешнепалітычныя задачы — прадухіленне небяспекі з боку Тэўтонскага ордэна, што захапіў частку літоўскіх зямель, і супрацьстаянне Залатой Ардзе.



*Вялікі князь літоўскі Вітаўт. Партрэт з Брэсцкага аўгусцінскага манастыра. Невядомы аўтар. Другая палова XVII ст.*

Поспехі ў знешняй палітыцы паспрыялі міжнароднаму прызнанню Вітаўта. У 1414–1417 гг. у Канстанцы (Германія) адбыўся царкоўны сабор, які разгледзеў прэтэнзіі Тэўтонскага ордэна да ВКЛ і Польшчы і прызнаў іх беспадстаўнымі. На бок саюзнікаў стаў і Папа Рымскі.

Значна ўмацавалася ўлада вялікага князя і ў самой дзяржаве. Пасля 1392 г. Вітаўт ліквідаваў на тэрыторыі ВКЛ большую частку ўдзельных княстваў, якія да таго мелі значную самастойнасць. На месцы былых удзельных князёў накіроўваліся намеснікі, якія мелі нашмат менш паўнамоцтваў і ўлады ў параўнанні з удзельнымі князямі. Напрыклад, намеснік не мог заключаць дамовы з суседнімі дзяржавамі, яго ў любы момант мог адклікаць вялікі князь. Дзейнасць намеснікаў паспрыяла ўмацаванню адзінства дзяржавы і павялічыла паступленне сродкаў у велікакняжацкую казну.

Але ўдзелы не былі знішчаны цалкам, не адразу мяняліся ў іх і традыцыі. Недасканаласць сістэмы кіравання на месцах патрабавала ад Вітаўта пастаянных падарожжаў па краіне. Часцяком толькі асабістае ўмяшанне гаспадара дазваляла вырашыць зацяжныя судовыя спрэчкі, арганізаваць спраўнае паступленне падаткаў і фарміраванне ўзброеных сіл.

Даведайцеся, пры якіх абставінах была сарвана каранацыя Вітаўта.

Павелічэнне аўтарытэту вялікага князя літоўскага дазволіла яму прэтэндаваць на тытул караля. Каранацыя мела адбыцца ў верасні 1430 г. у Вільні, але была сарваная. Неўзабаве пасля гэтага, 27 кастрычніка 1430 г., Вітаўт памёр. У перыяд яго праўлення ВКЛ дасягнула найвышэйшай магутнасці і ператварылася ў найбуйнейшую дзяржаву Еўропы. На 1430 г. тэрыторыя ВКЛ дасягала 900 тыс. км$^2$. Пры гэтым усходнеславянскія землі ў складзе дзяржавы сваёй тэрыторыяй пераўзыходзілі балцкія ў 12 разоў.

**8. Барацьба за ўладу пасля смерці Вітаўта.** Знаць ВКЛ пасля смерці Вітаўта, парушаючы ўмовы Гарадзельскай уніі, г. зн. без узгаднення з палякамі, абрала кіраўніком дзяржавы *Свідрыгайлу* (1430–1432 гг.), малодшага сына Альгерда. Імкнучыся ўмацаваць сваю ўладу, новы вялікі князь літоўскі абапіраўся не толькі на каталіцкую, але і на праваслаўную знаць. Парушыўшы Гарадзельскі прывілей, ён пачаў раздаваць важныя дзяржаўныя пасады прадстаўнікам праваслаўнай знаці. Гэта выклікала незадавальненне з боку каталіцкіх магнатаў, якія не хацелі пазбавіцца сваёй палітычнай манаполіі ў дзяржаве.

У ноч на 1 верасня 1432 г. каталіцкія магнаты пры падтрымцы польскіх саюзнікаў учынілі ў Ашмянах дзяржаўны пераварот. На чале змовы стаялі князь *Жыгімонт Кейстутавіч* (1432–1440 гг.), якога змоўшчыкі абвясцілі вялікім князем, і Сямён Гальшанскі. Свідрыгайла збег у Полацк. Дзяржава распалася на дзве часткі — Вялікае Княства Літоўскае са сталіцай у Вільні і Вялікае княства Рускае са сталіцай у Полацку і вялікім князем Свідрыгайлам на чале.

Дынастычная вайна ў ВКЛ

У 1432 г. Жыгімонт падпісаў з Ягайлам у Гародні унію, у якой прызнаваў над сабой вярхоўны суверэнітэт польскага караля на ўмовах уніі 1401 г., г. зн. абмяжоўваў самастойнасць Вялікага Княства Літоўскага толькі часам свайго жыцця. У вачах многіх сучаснікаў дзеянні Жыгімонта выглядалі абсалютна незаконнымі, бо Свідрыгайла быў зрынуты ў выніку перавароту і па праве працягваў заставацца законным вялікім князем літоўскім. Найбольш моцную падтрымку Свідрыгайлу аказала Полацкая зямля і ўся ўсходняя частка ВКЛ. Вырашальная бітва адбылася ў **1435 г.** каля *Вількаміра*. Свідрыгайла, нягледзячы на падтрымку лівонскіх рыцараў, прайграў бітву і збег. Полацк і Віцебск сталі апошнімі гарадамі паўночнай

часткі ВКЛ, якія ў 1436 г. падпарадкаваліся Жыгімонту Кейстутавічу. Хоць актыўныя баявыя дзеянні адбываліся ў ВКЛ у 1432–1436 гг., толькі ў пачатку 1439 г. Жыгімонт Кейстутавіч здолеў задушыць апошнія спробы супраціву сваёй уладзе.

Дынастычная вайна 1430-х гг. у ВКЛ значна аслабіла дзяржаву ў цэлым і пазіцыі праваслаўнай знаці ў прыватнасці. Слабасцю дзяржавы пачалі карыстацца суседзі.

Праўленне Казіміра Ягелончыка

**9. Змены ў дзяржаўным кіраванні напрыканцы XV ст., пераход да саслоўна-прадстаўнічай манархіі.** У 1440–1492 гг. вялікім князем літоўскім быў *Казімір Ягайлавіч* (з 1447 г. і польскі кароль). На доўгі час у Вялікім Княстве Літоўскім усталяваўся мір. У 1447 г. Казімір Ягайлавіч выдаў **прывілей**, які рэгуляваў адносіны паміж манархам і велікакняжацкай радай, вызначаў правы і абавязкі феадалаў перад дзяржавай.

**Прывілей** — заканадаўчы акт у ВКЛ, якім вялікія князі давалі або пацвярджалі асаблівыя правы пэўных груп насельніцтва.

## ПРЫВІЛЕЙ КАЗІМІРА 1447 г.




Ацаніце, як змянілася становішча шляхты ВКЛ з прыняццем прывілея Казіміра.

У *1468 г.* быў зацверджаны *Судзебнік* (звод законаў). Гэты дзяржаўны акт уводзіў крымінальную адказнасць за злачынствы, учыненыя супраць прадстаўнікоў улады і жыхароў дзяржавы. У ім былі вызначаны і віды пакаранняў: грашовы штраф, збіццё, смяротнае пакаранне.

Пераемнікам Казіміра Ягайлавіча на прастоле ВКЛ зрабіўся яго сын *Аляксандр Казіміравіч* (1492–1506 гг.), з 1501 г. польскі кароль.

### Складванне саслоўна-прадстаўнічай манархіі

З'яўляючыся адначасова польскімі каралямі, вялікія князі літоўскія шмат часу праводзілі ў Польшчы. У гэты час усе асноўныя пытанні ў ВКЛ вырашала рада (Паны-Рада). Па сутнасці, яна кіравала дзяржавай. У 40-я гг. XV ст. рада ператварылася ў важны орган дзяржаўнага кіравання. Заканадаўча пашырыў і замацаваў правы рады вялікі князь Аляксандр Казіміравіч у прывілеі *1492 г.* Рада ВКЛ складалася з найбуйнейшых феадалаў, каталіцкіх біскупаў і найвышэйшых службовых асоб.

Умацаванне эканамічных сувязей унутры Вялікага Княства Літоўскага, узмацненне працэсу цэнтралізацыі выклікалі неабходнасць шырэйшага прыцягнення шляхты да вырашэння агульнадзяржаўных пытанняў. З гэтай мэтай склікаліся *агульнадзяржаўныя (вальныя) соймы* — сходы прадстаўнікоў феадальнага саслоўя. Першапачаткова на соймы запрашалі ўсіх буйны́х землеўладальнікаў, якія засядалі ў радзе, найважнейшых асоб не толькі цэнтральнай, але і мясцовай адміністрацыі, а таксама ўсю шляхту. Ужо ў XVI ст. сойм ператвараецца ў прадстаўнічы орган, на пасяджэнні якога з'яўлялася не ўся шляхта, а толькі яе прадстаўнікі — па два дэпутаты (паслы) ад кожнага павета, якія абіраліся на павятовых сойміках.

У канцы XV — першай палове XVI ст. Вялікае Княства Літоўскае зрабілася саслоўна-прадстаўнічай манархіяй.

*У XIII ст. на карце свету з'явілася новая дзяржава — Вялікае Княства Літоўскае, асноўную частку якой складалі землі Беларусі. Маладая дзяржава прайшла суровыя выпрабаванні на трываласць, вытрымала войны з небяспечнымі ворагамі ў асобе крыжакоў і манголаў. На працягу наступных двух стагоддзяў вялікія князі літоўскія здолелі значна ўзмацніць сваю ўладу, што знайшло адбітак у пашырэнні тэрыторыі дзяржавы і ўмацаванні яе статусу на міжнароднай арэне.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| 40-я гг. XIII ст. — утварэнне мангольскай дзяржавы — Залатой Арды | 30-я гг. XIII ст. — пачатак складвання Вялікага Княства Літоўскага |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Складзіце схему «Прычыны ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага».
2. Абапіраючыся на картасхему на с. 38, раскажыце пра асноўныя напрамкі і шляхі пашырэння межаў ВКЛ. Растлумачце змены ў назве дзяржавы, што адбываліся на працягу XIII–XV стст.
3. Складзіце табліцу «Барацьба вялікіх князёў літоўскіх за ўмацаванне ВКЛ», адлюстраваўшы ў ёй даты, падзеі і іх вынікі.
4. Ахарактарызуйце месца беларускіх зямель у складзе ВКЛ, ролю мясцовай шляхты ў кіраванні дзяржавай.
5. Як на працягу XIII–XV стст. змяняліся паўнамоцтвы вялікага літоўскага князя, рады і сойма ў ВКЛ?
6. Прывядзіце прыклады уній у гісторыі іншых дзяржаў Сярэднявечча.